# СУЧАСНЫЯ МОЛАДЗЕВЫЯ МЯНУШКІ: СЕМАНТЫКА-СТРУКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

***У. У. Кабушка***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца класіфікацыя мянушак паводле структуры, а таксама разглядаецца семантыка наяўных неафіцыйных найменняў у гаворцы студэнтаў. Мянушкі складаюць адметны лексічны пласт у маўленні моладзі і адносяцца да тых моўных сродкаў, пры дапамозе якіх не толькі называецца асоба, але і перадаецца пэўная інфармацыя пра яе, характарызуюцца і ацэньваюцца знешнія і ўнутраныя якасці чалавека, перадаюцца разнастайныя дадатковыя, канатацыйныя, значэнні.

**Ключавыя словы:** мянушка; патронімы; матронімы; андронімы; гінонімы; адэльфонімы; простыя, складаныя і састаўныя мянушкі.

У беларускай лінгвістыцы праблема комплекснага аналізу мянушак пакуль што не атрымала глыбокага тэарэтычнага і практычнага асэнсавання, хоць за апошнія дзесяцігоддзі і з'явіліся навуковыя даследаванні, прысвечаныя вывучэнню і апісанню ўласных імёнаў. Даследаваннем мянушак займаліся такія навукоўцы, як А. М. Селішчаў, А. У. Суслава, А. В. Супяранская, М. В. Бірыла і інш. Мянушкі Гомельскай вобласці, напрыклад, даследавалі В. В. Шур, Н. І. Новік, У. А. Бобрык, В. В. Струкаў і інш.

Мянушкі складаюць адметны пласт лексікі любой мовы. ***Мянушка*** – найменне, якое даецца чалавеку замест або акрамя яго афіцыйнага імя і якое вылучае якую-небудзь найбольш характэрную рысу яго характару, знешнасці, роду заняткаў [1, с. 23]. Часам асновай мянушкі становіцца пэўная жыццёвая сітуацыя або здарэнне, якое адбылося з яе будучым носьбітам.

Матэрыялам для нашага даследавання паслужылі мянушкі, якія функцыянуюць у маўленні маладых людзей – студэнтаў, школьнікаў. Гэтыя найменні былі сабраны шляхам апытвання студэнтаў розных факультэтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, пераважна студэнтаў 1–4 курсаў філалагічнага, гістарычнага і фізіка-матэматычнага факультэтаў, Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, розных факультэтаў Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, а таксама Беларускага нацыянальна-тэхнічнага ўніверсітэта. Падчас апытвання было вестветлена, што 70% апытаных маюць мянушкі ці выкарыстоўваюць іх у адносінах да сваіх сяброў і знаёмых, 44% – станоўча ставяцца да ўзнікнення і ўжывання мянушак у паўсядзённым жыцці, астатнія – адмоўна.

Пры ўжыванні мянушкі перадаюць розныя эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні. Усе мянушкі ўтвараюцца пры дапамозе розных спосабаў і прыёмаў. Сярод найменняў для ўнутрысямейных адносін адрозніваюць наступныя: патронімы, матронімы, андронімы, гінонімы і адэльфонімы.

Індывідуальныя патронімы могуць мець у сваім складзе не толькі суфікс *–ав-* (***Лойкава*** – дачка Лойкі), але і іншыя суфіксы і нават прыстаўкі (***Зюлька*** ад Зюль). Сямейныя мянушкі – матронімы, утвораныя ад імені гаспадыні, часта бываюць аманімічныя з прыналежнымі прыметнікамі і ўключаюць суфікс –ін –: ***Волін*** **–** ад Вольгі, ***Дуніна*** – ад Дуня. Пры ўтварэнні андронімаў актыўна выкарыстоўваецца суфікс – *іх(а), – ых(а*): ***Саўчыха*** ад імя мужа Саўка, ***Арнольдзіха*** ад імя мужа Арнольд, ***Арсеніха*** да імя мужа Арсеній. Суфікс – *іх(а)* з'яўляецца настолькі актыўным пры называнні жанчын, што можна ўтвараць мянушкі ад прозвішчаў саміх жанчын: ***Бадуніха*** ад прозвішча Бадун, ***Караніха*** ад прозвішча Корань, ***Цвірыха*** ад прозвішча Цвірка.

Частымі з'яўляюцца мянушкі, утвораныя ад уласных асабовых імён у іх змененым, пераасэнсаваным выглядзе: ***Вандам*** ад Вадзім (параўн.: Жан Клод Вандам), ***Улітка*** ад Ульяна. Мянушкі прадстаўнікоў розных сацыяльных і ўзроставых груп маюць шэраг агульнага ў матывацыі: многія з іх паходзяць ад прозвішчаў, характарызуюць захапленні, фізічныя і псіхічныя асаблівасці носьбіта, узніклі пасля пэўных падзей ці ўчынкаў носьбіта. Адрозненні заўважаюцца ў лексічным напаўненні семантычных груп. Так, найменні моладзі часам уключаюць адзінкі са слэнга, паўтараюць імёны ўдзельнікаў папулярных музычных гуртоў, герояў перадач: ***Рэпер*** – хлопец, які апранаецца ў шырокія джынсавыя штаны і «байкі» з капюшонам, ***Халява*** – дзяўчына, якая падчас сесіі нічога не вучыць, а толькі ў вокнах «халяву ловіць».

У маўленні моладзі найбольш ужывальнымі з'яўляюцца мянушкі, утвораныя ад *'nomina personalia'*, гэта значыць ад уласных імён, імён па бацьку, прозвішчаў. Сярод такіх онімаў надзвычай пашыраны менавіта адпрозвішчныя: ***Басік, Басяня, Басіпуся*** ад Басан, ***Гулак*** ад прозвішча Гулакоў, ***Дзяцел*** ад Дзятлікава, ***Жужык*** ад Журун, ***Казёл*** ад Казлоўскі. Адпрозвішчныя мянушкі маюць шмат агульнага з ацэначна-характарыстычнымі: адпрозвішчныя, як і ўсе мянушкі, ужываюцца ў абмежаваным асяроддзі, акрамя асноўнай намінатыўнай, выконваюць інфарматыўную і кантактную функцыі. Сказанае дазваляе ўключыць іх у разрад мянушак.

Часам прычынай узнікнення мянушак з'яўляецца цяжкасць вымаўлення, незразумеласць семантыкі прозвішча: ***Гузмэн*** ад Гузакоў, ***Эльдарада*** ад Эдуардаўна.

Частка адпрозвішчных мянушак утворана шляхам усячэння фіналі прозвішча, нярэдка з далучэннем суфіксаў – *ік(ык), – чык*: ***Адам*** ад прозвішча Адамовіч, ***Барыс, Бора*** ад Барысаў, ***Галава*** ад Галаўнёў, ***Гулак*** ад прозвішча Гулакоў, ***Казанова*** ад Казановіч, ***Разік*** ад Разумоўскі, ***Рубі*** ад прозвішча Рубанава, ***Фенька, Фендзік*** ад Фендзіч, ***Федзя*** ад Фёдарава, ***Шыма*** ад Шымановіч.

Сустракаюцца неафіцыйныя онімы, якія сведчаць пра негатыўныя адносіны да носьбіта мянушкі або ўжываюцца, каб абразіць чалавека, пасмяяцца з яго. Такія антрапонімы могуць рыфмавацца з імёнамі, прозвішчамі, змяшчаць дадатковыя звесткі пра носьбіта або ўяўляць сабой трансфармаваныя гукавыя абалонкі імені: ***Шашлыка*** ад Шаплыка, ***Сэр Грэй*** – ад Сяргей.

Мянушкі па асаблівасцях частак цела валодаюць празрыстай унутранай формай і характарызуюць зубы, форму галавы, вушы, нос, плечы і інш.: ***Бамбур*** – хлопец буйны ў целе, ***Бінокль*** – хлопец, які носіць акуляры, ***Бусел*** – светлавалосы хлопец з доўгімі нагамі, ***Гарбуз*** хлопец, у якога вялікая галава, ***Грэмлін –*** хлопец, у якога ніжняя сківіца вельмі вылучана ўперад і вялікія жоўтыя зубы, ***Мазута*** – дзяўчына са смуглым колерам скуры, ***Нітка*** – дзяўчына з доўгімі валасамі, ***Піранья*** – бяззубая дзяўчына, ***Хакеіст –*** бяззубы хлопец. Мянушкі, дадзеныя па асаблівасцях голасу, маўлення ўказваюць на артыкуляцыйныя асаблівасці асобы, называюць словы, якія носьбіт часта ўжывае, характарызуюць гучнасць голасу: ***Ціх*** – хлопец, якія вельмі ціха размаўляў, ***Рупар*** – дзяўчына з моцным голасам.

Таксама мянушкі ўзнікаюць на аснове супрацьпастаўлення назвы мянушкі і якасцей чалавека: ***Аратар*** – хлопец, які тараторыць і без інтанацыі прамаўляе тэкст, ***Парфюмер*** – хлопец, ад якога дрэнна пахне.

Паводле структуры ўсе неафіцыйныя найменні можна падзяліць на простыя, складаныя і састаўныя. Простыя мянушкі – гэта аднаслоўныя адзінкі, якія маюць адзін корань: ***Аўрос*** *ад Аўросімаў,* ***Барбі*** *– дзяўчына, якая апранаецца і выглядае, як лялька,* ***Галава –*** *разумны хлопец,* ***Гулак*** *ад прозвішча Гулакоў,* ***Гэго*** *– бесталковы хлопец,* ***Кеша*** *– балбатлівы хлопец, які нагадвае папугая,* ***Крот –*** *хлопец, які носіць вялікія чорныя акуляры,* ***Моця*** *ад Мойскі,* ***Муха*** *– маленькі і хуткі хлопец,* ***Свіння*** *– брудны, неахайны хлопец.*

Складаныя мянушкі маюць дзве (найчасцей) і больш каранёвыя марфемы, якія ўтвараюць адно слова: ***Відэакамера –*** *дзяўчына, якая шукала сваіх братоў,* ***Гунгуська –*** *хлопец, у якога невыразнае маўленне, які гундосіць,* ***Зоркае вока*** *– хлопец, які вельмі моцна жмурыцца,* ***Майскі жук –*** *прозвішча Мойскі і нарадзіўся ў маі,* ***Мядзведзь-заіка –*** *паўнаваты хлопец, які заікаецца,* ***Мясарубка*** *– дзяучына, якая вельмі многа размаўляе, лапоча без перапынку,* ***Мегарашэба –*** *хлопец, які ўсё рашае і дае спісаць іншым.*

Да ліку складаных варта аднесці таксама мянушкі-абрэвіятуры:

а) складовыя: ***Зачуха –*** *хлопец, якія ажаніўся і жыў з цешчай, нібы загадваў чужой гаспадаркай (руск. За – заведующий, чу – чужим, ха – хозяйством);*

б) літарныя: ***КВ*** *– Ковель,* ***ЦРУ*** *– пра таго, хто ведае ўсё і пра ўсіх;*

в) гукавыя: ***ГАІ –*** *Гуліцкі Андрэй Іванавіч,* ***ДАІ*** *– Данісевіч Анастасія Іванаўна.*

Стварэнне мянушак-абрэвіятур можа тлумачыцца пэўнай камунікатыўнай задачай, напрыклад, выкарыстаннем своеасаблівай «шыфроўкі» паведамлення, паколькі сэнс мянушкі-абрэвіятуры звычайна вядомы абмежаванаму колу людзей [2, с. 38].

Састаўныя мянушкі складаюцца з двух і больш слоў: ***Метр у кепцы*** *– хлопец невысокага росту,* ***Цёця Ася –*** *дзяўчына, якая вядзе сябе як дарослая жанчына,* ***Вялікая Шыма*** *– дзяўчына з прозвішчам Шымановіч і да таго ж паўнаватая.* Як бачна з прыкладаў, у структуру састаўных найменняў могуць уваходзіць наступныя кампаненты: уласнае імя, імя па бацьку, характарыстыка па сацыяльным статусе, фізічных і псіхічных асаблівасцях носьбіта і інш.

Але можна заўважыць, што ў асяроддзі маладых людзей найчасцей ужываюцца простыя ці складаныя мянушкі, бо іх значна прасцей вымаўляць і яны не патрабуюць тлумачэння (такія мянушкі лёгка запамінаюцца).

Такім чынам, мянушкі ўваходзяць у самы старажытны пласт лексікі і разам з тым захоўваюць сваё прызначэнне сярод сучасных найменняў. Іх можна назваць пастаяннымі спадарожнікамі чалавека, якія не толькі называюць асобу але і нясуць інфармацыю пра яе.

## *Літаратура*


1. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: структура ўласных мужчынскіх імён / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 320 с.
2. Гілевіч, Н. І. Аб адным тыпе антрапонімаў / Н. І. Гілевіч // Беларуская мова. – 1980. – Вып. 8. – С. 35–41.